Беларускі Звон

ТЫДНЁВАЯ ЧАСОПІСЬ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9). Рэдакцыя адчынена: 12 — 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Рукапісы павінны быць напісаны чытальна і толькі на адным баку паперы, з праўдзівым прозьвішчам аутара і адрасам (для ведама Рэдакцыі). Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана кожнага нумару 500 м. п. Падпіска на адзін месяц з дастаукай да хаты 2000 м. п. Для заграніцы удвая даражэй. Цана абвестак: перад тэкстам 1000 мк., сярод тэксту 800 мк. і на апошняй страніцы 400 мк. за радок пэтыту у 1 шпальт.

Год III. **Субота, 24-га лютага 1923 г.** **№ 1**

Палітычныя падзеі.

Францыя. Палата дэпутатаў бальшасьцю 515 галасоў проціў 68 галасоў сацыялістаў прыняла праэкт аб удзяленьні Польскаму ўраду 400 мільёнаў франкаў.

У Лілі, асяродку прамысловасьці паўночнай Францыі, адбываецца кангрэс французкай сацыялістычнай партыі, якая у сучасны момант працуе ў цяжкіх варунках пад адбудовай соцыялізму ў Францыі, маючы проціў сябе моцныя арганізацыі капіталістаў і крайне-рэакцыйную парлямэнцкую большасьць. З прывітаньнямі выступалі прадстаўнікі заграніцных сацыялістычных партый; найбольшае зацікаўленьне вызвала прамова дэлегата нямецкіх сацыялістаў Гільфэрдінга, ў якой падкрэсьлівалася абавязковая патрэбнасьць супольнай працы сацыялістаў усіх краёў, перадусім французкіх і нямецкіх, асабліва, калі прыняць пад увагу, што Рур і Масул—барацьба за вугаль і газу—можа выклікаць новы сусьветны пажар. Францускія камуністы прыслалі тэлеграму, прапануючы адналіты фронт з сацыялістамі.

Баўгарыя перажывае палітычны крызыс. Магчыма, што Стамболійскі, пакінуты праз большасьць сваіх прыхільнікаў, змушаны будзе шукаць падтрыманьня ў камуністаў і такім чынам падлягаць маскоўскім уплывам.

Амэрыка. Найлепей ува ўсім сьвеце зарганізаваная амэрыканская буржуазія вядзе моцнае змаганьне з работнікамі і дзеля гэтага стараецца разьбіць адзіны работніцкі фронт, дзелячы работнікаў па „тых, хто гаворыць паангельску“ і па „тых, што ня ўмеець гаварыць паангельску“. Урад спагадліва йдзе на спатканьне гэтым жаданьням. У многіх штатах пазбаўлена права галасаваньня тых, хто ня ўмеець чытаць і пісаць паангельску. Прэзыдэнт Гардынг прапанаваў прыняць закон аб рэгістрацыі ўсіх чужаземцаў-работнікаў. Унесены праекты аб пазбаўленьні грамадзянскіх правоў, высылцы кожнага чужаземнага работніка, які браў бы ўдзел у забастаўцы, або сказаў прамову па забастовачным сходзе і г. д. Усе гэтыя рэпрэсіі вядуцца, нібы-то, пад знакам барацьбы з камунізмам.

Швэцыя. Сындыкат швэцкіх фабрыкантаў абвясьціў локаут, дзеля чаго застаецца бяз работы 65.000 работнікаў.

Вэнгрыя. Работнікі дамагаюцца павялічэньня зарабатнай платы, пагражаючы забастоўкай.

Лік безработных у Эўропе павялічыецца. Больш як 12 мільёнаў безработных жывуць з жабрацкіх дапамогаў, якія выплачываюць ім урады, ратуючы іх ад галоднай сьмерці.

Міжнароднае бюро працы Лігі народаў падае такія цыфры безработных у паасобных краінах у лістападзе пр. г.: Англія—1.733 600; Італія — 317.009; Нямеччына—113.231; Чэхія—106.009; Польшча—87.000; Швайцарыя—48.208; Аўстрыя—38.483; Швэцыя—37.300; Бельгія—27.110; Галяндыя—26.395 і Францыя — 13.500. У апошнія часы лік безработных шмат павалічыўся.

Англія. 13-га лютага адчынілася сэсыя ангельскага парлямэнту. Кароль у троннай прамове паказаў на мірны кірунак ангельскай заграніцнай палітыкі. Бонар Лоу падробна высьвятліў справу нямецкіх даўгоў і акупацыю Рура і нэйтральнасьць Англіі ў гэтай справе.

Літва. У Клайпэдзе арганізаваны новы Урад з трох літоўцаў і двух немцаў. Саюзьнікі маюць замер прызнаць правы літоўцаў на Клайпэду, засьцерагаючы вольнасьць порту для гандлёвых зносін суседніх дзяржаў. Францускае войска пакінула Клайпэду, выехаў і польскі пасол. Рэспубліка Панама ў Амэрыцы прызнала Літву de jure.

Польшча. 15-га лютага палякі пачалі займаць прысуджаную ім частку нэйтральнай зоны. У некаторых мяйсцох дайшло да аружнага змаганьня з літоўцамі. Есьць забітыя і раненыя. Літоўцы ўзрываюць масты.

У Варшаве адбыўся вялікі мітынг безработных, якія дамагаюцца ўвядзеньня законаў аб сацыяльным абясьпечаньні.

Польская статыстыка і беларусы.

Польская статыстыка праўдай і няпраўдай хоча давясьці, што на т. наз. Kresach жывуць у большасьці паляки, а што да беларусаў, дык бадай зусім няма,—яны жывуць там недзя за Дзьвіной і ў Польшчы іх есьць каля мільёна. Гэтае злоснае перакручываньне праўды губіць сваю падставу, калі паўзіраемся на вынікі недаўна прайшоўных выбараў. А вось яшчэ адзін яркі факт таго што „жыў беларус і будзе жыць“. Не зважаючы на рэпрэсіі, якія робіць польская адміністрацыя ў адносінах да беларусаў 442.000 рэпатрыянтаў з Савецкай Расеі зарэгістраваліся як беларусы і гэта ў працягу ўсяго толькі аднаго году.

Паштовыя зносіны з Сав. Расеей.

У хуткім часе ў Маскве адчыняецца канфэрэнцыя аб заключэньні польска-расейскага паштова-тэлеграфнага дагавора. Да гэтых часоў паштова-тэлеграфныя зносіны Расеі з Польшчай адбываліся праз Латвію.

З газэт.

„Kurjer Polski“ так характэрызуе сучаснае фінансавае становішча Польшчы:

„1-га верасьня 1920 г. ўся эмісія ў Польшчы, калі пералічыць на франкі, іначай кажучы—ўвесь абаротны капітал—налічываў 876.170.000 залатых франкаў, 1-га студня 1923 г. упаў да 223.155.000 зал. фр., а 1-га лютага г. г.—121 851.000 зал. фр.“

Такім чынам за час ад 1 верасьня 1920 г. да 1-га лютага 1923 г. Польшча страціла 6/7 абаротнага капіталу. Але калі прыняць пад увагу, што за гэты час пакупная вартасьць швайцарскага франка паменшылася, дык трудна аблічыць у колькі разоў паменшыўся абаротны капітал, але

„ня зробім аднак жа памылкі западта вялікага пэсымізму, калі скажам, што цяпер маем абаротнага капіталу ў 30 разоў менш, як 1920 годзе!“

А далей:

„У параўнаньні з прадваенным станам маем цяпер менш, як дзесятую частку абаротнага капіталу, патрэбнага для гаспадарчага жыцьця на сучасным ураўні. На каждага жыхара прыпадае 4,31 шв. фр.“

Сьцвердзіўшы, што пры такой суме, значная частка якой ідзе на спэкуляцыю, не магчыма інтэнсыўнае разьвіцьце зямельнай гаспадаркі, а тым болей прамысловасьці і гандлю, газэта прыходзіць да такога вываду:

„... стаімо над процасьцю. Стаімо перад эканамічнай і палітычнай катастрофай“.

З Савецкай Беларусі.

Характэрыстыка Беларускага Дзяржаўнага тэатру у Менску.

Гр. Херсонскі прачытаў цэлы нарыс аб маладым Беларускім тэатры, які мае быць зьмешчан у адным з маск. журналаў. Ен падкрэсьліў, што у беларускім зусім яшчэ маладым тэатры, які, як тэатр, істнуе толькі з 1918 г., відаць праца акцёраў, відаць вышуканьні, відаць і немалыя (як для маладога тэатру) дасяганьні. „Мяне як вясновым даждэм аблілі жыцьцярадасныя пастаноўкі беларускага нацыянальнага тэатру гэткіх п'ес, як „На купальле“ і „Машэка“, —чытаў у сваім артыкуле т. Херсонскі. У канцы нарысу прамоўца сказаў, што калі Беларуская драматычная студыя ў Маскве, якая кіруецца вядомым акцёрам і тэарэтыкам тэатральнага мастацтва т. Смышляевым В. С., закончыць сваю працу і прыедзе тварыць тэатр, то беларускі тэатр чакае вялікая будучына. Т. Херсонскі адзначыў здольнасьць і талентнасьць артыстаў сучаснай беларускай трупы, такіх напр., як Грыгоніса, Ржэцкую, Новік і гаварыў аб тым непасрэдным зьвязку іграючых артыстаў з публікай, акая ў канцы акту выказвае сваё здаваленьне шчырымі гарачымі воплескамі.

Загляне сонца і у наша ваконца.

(Магільнянская валасьць, Менскага павету).

Магільнянскі Валасны Выканаўчы Камітэт, шчыра праводзіць Культурна-Асьветную працу.

За тры тыдні ўсьпеў перавезьці з бышага маёнтку будынак і пастроіць у мястэчку тэатр. Абсталявалі хату чытальню. Дапамагаюць у працы настаўнікі мясцовай сямёхгадоўкі і вясковых пачатковых школ з удзелам вясковай моладзі. З 7 да 15 студзеня было пастаўлена 5 спэктакляў-вечароў, на якіх рабіліся даклады аб міжнародным становішчы. Сяляне вельмі зацікаўлены Беларускай культурай. Есьць надзея, што мясцовымі сіламі кожны тыдзень будуць ставіцца гэткія спэктаклі.

Вясковая моладзь таксама заварушылася. Касьцяшоўскі Гурток Моладзі зрабіў пастанову зрабіць гэткі самы тэатр, у сваёй вёсцы, дзе была-б магчымасьць разумна правесьці свабодны час. Бацькі згадзіліся дапамагчы ім.

Язьвінскі.

Савецкая прэса аб канфэрэнцыі у Лазане.

„Правда“, сьцверджаючы фактычны канец Лазанскей канфэрэнцыі, даказаўшай, як і ўсе папярэднія, немагчымасьці рашаць заблутаныя праблемы сучаснай міжнароднай палітыкі старымі дыплёматычнымі срэдствамі — заяўляе, што Бліжне-усходняе пытаньне можа быць вырашана толькі на падставе самаазначэньня народаў.

„Известия“ пішуць, калі зрыў Лазанскай канфэрэнцыі паграджае новай вайной, Турцыя павінна ведаць, што шчырага прыяцеля яна мае толькі ў асобе Расеі, якая зьяўляецца настолькі магутным фактарам міжнароднай палітыкі, што яе прыязнь можа абараніць ад небясьпекі вайны.

У справе арыштаваных беларусаў.

Як мы даведаліся ў апошнія часы уся справа пасаджаных ў Горадзенскі і Беластоцкі вастрог выяўляецца па афіцыяльных даных ў гэткім больш-меньш выглядзе. В. Маслоўская, Э. Матэйчук, А. Парук, А. Трыпуза, С. Жабінскі і інш. ў агульнай лічбе 73 асобы абвінавачываюцца за удзел іх ў загаворы у лютым месяцы 1922 г., які нібы меў мэтай адарваньне ад Польскай Дзяржавы земляў, заселеных мяшанай беларуска-польскай люднасьцю, пры помачы аружнага паўстаньня, тэрорыстычных нападаў, падпалаў, забойстваў, узрываньня мастоў на чыгунках і інш. Суд над імі ў Беластоку меўся ўжо было адбыцца ў канцу студзеня г. г. Абвінавачваюцца яны па 10, 455, 562 і 584 артыкулам Кодэксу Карнага.

Апрыч гэтай справы яшчэ Гродненскі Акружны Суд мае судзіць А. Міленькевіча, П. Юрэчку, В. Юрэчку і іншых, разам 81 асобу, якія таксама ўжо блізка год цэлы сядзяць ў вастрозе; абвінавачваюцца яны за дзееньні перадугледжаныя ў арт. 51 і 102 ч. II Карнага Кодэксу. Калі мае адбыцца суд над імі—няведама.

Беларускія депутаты ў Польскім Сойме ў Варшаве парушылі было гэтую справу з мэтай прысьпешыць вырашэньне яе і палепшыць варункі, у якіх знаходзяцца гэтыя людзі ў вастрозе ўжо каля году. Але пакуль што уся гэтая справа ледзьве-ледзьве скранулася з мейсца.

Тым часам—як мы даведаліся надовічы—дэпутаты Беларускага і Украінскага Клюбаў склалі ў Сойме сьпешную інтэрпэляцыю ў справе амнэсты, якая мае гэткі зьмест:

Ад апошняй амнэстыі ад 24 траўня 1921 г. суды і пракурорскія урады закіданы судовымі справамі.

Сярод нявыканых спраў вялікі лік за палітычныя праступленьні, а таксама і прасовыя, зьвязаныя з перадвыбарнай працай, альбо зробленыя з прычыны цяжкога матэр'яльнага становішча ў барацьбе працуючых мас за сваё лепшае бытаваньне.

Вялікі лік такіх спраў знаходзіцца цяпер на „Kresach Wschodnich“ і Усходняй Галіччыне; справы гэтыя падняты супроць беларусаў і украінцаў за праступленьні з прычын палітычных.

Ненармальныя варункі на „Kresach“ усходніх (землі беларускія і ўкраінскія), а такжа і ў Усходняй Галіччыне, дзе пануе тэрар і бёспраўе адміністрацыі, якая ў рожнай праяве грамадзкага жыцьця беларускіх і ўкраінскіх жыхароў хоча бачыць толькі ворагаў, дамагаючыхся пераварoту альбо нелегальных паступкаў і гэтым настраіваюць грамадзянства да барацьбы супроць безпраўя.

Легальна істнуючыя культурна-грамадзкія ці эканамічныя установы беспраўна зачыняюцца, а працаўнікі гэтых арганізацый садзяцца ў вастрогі. Адміністрацыя-ж прыкладае ўсе стараньні каб падняць у тэй ці іншай форме судовую справу, маючую супроць дзяржаўны характар.

Сваімі паступкамі адміністрацыя дэмаралізуе жыхарства і змушае да тварэньня актыўнай барацьбы, як пратэст супроць нарушэньня законаў і гвалтаў над народным пачуцьцём. Барацьба гэтая прымае часам формы непажаданыя і пераходзяць часта на шлях конспэрацыйнай барацьбы.

У такой хворай атмасфэры разьвіваецца грамадзкае жыцьцё беларусаў і украінцаў.

Дараваньне віны абвінавачаным і спыненьне гэтых спраў патрэбуе справядлівасьць.

З прычыны склікаўньня першага Сойму і Сэнату, а такжа з прычыны выбараў першага Прэзыдэнта Рэчыпаспалітай Польскай падпісаныя ўносяць: Высокі Сойм ухвалу хай пpыме: прызываецца Урад:

1. Усялякія справы, створаныя супроць беларусаў і ўкраінцаў на палітычных падставах, ня гледзючы па якому артыкулу кадэксу карнага абвінавачываюцца, спыніць, а абвінавачаных вызваліць з вастрогаў.

2. Прадоўжыць у працягу дзьвух

тыдняў ад сягоняшняга дня праект устава амнэстыі, датычычай вышэй памянёных спраў.

(Подпісы беларускіх і украінскіх паслоў.)

25 І. 23 г.

Мае думкі.

Як выявілася ў апошнія часы адчыненьне прыватных беларускіх школ абстаўляецца надта значнымі фармальнасьцямі. Калі дакладна разгледзім тую інструкцыю (№ 5 „Наш. Буд“), якая выдадзена праз п. Куратара Віленскага Школьнага Акругу, дык можам пабачыць, што глухая якая небудзь нашая беларуская вёска, дзе быць можа ня знойдзецца рупнага інтэлігентнага чалавека ня скора будзе мець сваю пачаткавую школу. Можна лічыць, што адчыненьне па гэтай інструкцыі школ магчыма толькі ў мястэчках ці ў тых вёсках, якія добра арганізаваны. Але і тут—усё-ж залежыць ад інспэктара і ад яго адносін да беларускае школы, а ўжо гэтыя адносіны мы добра, надта добра ведаем.

У інструкцыі гаворыцца, што ня толькі Таварыствы з адпаведным Статутам, але і паасобныя людзі могуць адчыняць прыватныя школы. Але дзе ўжо нам спадзявацца на тое, што тая ці іншая асоба дастане концэсію на школу, калі нават нашая Цэнтральная Школьная Рада ня мае гэтага права дагэтуль, бо да гэтага часу не здалела дабіцца, каб Статут яе быў зацьверджаны польскай ўладай.

§ 3 памянёнай інструкцыі паказвае, што вучыцялёў ў беларускія прыватныя школы зацьвярджае школьны польскі інспэктар. З фармальнага боку можа гэта так і патрэбна, але па сутнасьці рэчы яно вядзець да таго, што беларуская прыватная школа можа і не пабачыць сьвету, бо як адносяцца польскія школьныя інспэктары да беларускага вучыцельства дакладна нам ведама. На гэта ёсьць у нас сотні фактаў, гэтых „прыхільных адносін“.

Інспэктар школьны а ня хто небудзь іншы мае выясьняць кваліфікацыю беларускага вучыцеля па гэтай інструкцыі. Тут вялікі прастор даецца інспэктару, бо, як сьцьвярджаюць факты, вучыцель, які скончыў вучыцельскую сэмінарыю пасьля 1914 г. ня мае права выкладаць лекцый ў пачаткавай школе (Лідскі інспэктар да вучыцеля Аляксандра Кузьмы), альбо калі і ведае польскую мову, дык „ня быў на польскіх курсах“. Дзеля гэтага таксама адмоўны адказ. А калі і з гэтага боку усё ў парадку, дык неадпаведным можа быць залічаны вучыцель з боку палітычнага. Досыць маем мы прыкладаў і на гэта. Агулам кажучы, стацца вучыцелем белар. пачаткавай школы нават прыватнай дужа і дужа цяжка, бо усё залежыць толькі ад польскага інспэктара.

Спытаецеся можа дарагія чытальнікі, а як жа з устанаўленьнем кваліфікацыі вучыцеля з боку беларускага? А ні як; так сабе. Бо інспэктарам жа — паляк, які мовы беларускай сам ня ведае, цы не яму-ж і дбаць аб гэтым, наадварот ён абсалютна ня хочаць лічыцца з дакументамі вучыцеля ад Беларускай Школьнай Рады ці ад Беларускіх Вучыцельскіх Курсаў (Дзісна, Ліда, Валожын), а калі і вызначае каго небудзь на выкладаньне беларускае мовы ў польскіх школах, каб толькі заманунь туды беларускіх дзетак для палёнізацыі, дык якраз тых, якія дрэнна ведаюць беларускую мову, вучыцялёў русафілаў, альбо якія зусім ня былі на Беларускіх Вучыцельскіх Курсах (Вучыцель Сівец у польскай школе ў Гарадзьках, Валожынскага павету).

Пярэйдзім да § 4 памянёнай інструкцыі. Як абавязковы прадмет у прыватнай беларускай пачаткавай школе польская мова павінна выкладацца, пачынаючы з II аддзелу і ў тым самым ліку гадзін, як і для беларускай мовы, апрача таго гісторыя і географія Польшчы павінны выкладацца таксама ў польскай мове. Добрая-ж тады будзе беларуская школа, калі большая якраз частка прадметаў пачаткавае школы будуць выкладацца ў чужой для беларускага дзіцяці мове. Нашто-ж тады назва для школы—б е л а р у с к а я, калі зьмест не адпавядае гэтаму? Калі на утрыманьне урадовае школы дзяржава нешта і даець — праўда, набіраючы з сялян рознага віду падаткі—дык жа аб субсыдыях на прыватную п а ч а т к а в у ю беларускую школу мы пакуль што ніскуль ня чулі, а запатрабаваньні да яе з боку школьнае ўлады вымагаюцца вялікія.

„Падручнікі ў прыватных школах зацьвярджае куратар“ (§ 5). Так піша п. Гонсероўскі ў сваёй інструкцыі, выданай у Вільні, а п. Страчынскі, школьны інспэктар у Валожыне (вёрст 80 ад Вільні), які, праўда, падлягае да куратара суседняга школьнага акругу, прыказывае „ўлюблёнаму“ сваіму вучыцелю Сіўцу ў Городзках выкладаць беларускую мову толькі на падручніках, якія будуць надрукаваны л а ц і н с к і м і літарамі. І гэта ў той час, як гістарычным старадаўным нашым шрыфтам ёсьць кірыліца—гражданка.

Пры гэткай спагадзе „прыхільных“ да беларускае прасьветы польскіх школьных інспэктароў мы не далёка заедзем.

Наглядчымі ўладамі над беларускай прыватнай школай ёсьць інспэктар і куратар (§ 6) Толькі? А дзе-ж нагляд ад Беларускай Школьнай Рады? Хто-ж мае наглядаць за добрым і належным выкладаньнем беларускай мовы? Ня-ўжо ж таксама толькі куратар і інспэктар, якія (Валожын, Дзісна, Вялейка) ня хочуць гаварыць з вучыцелямі нашымі, калі апошнія ў гутарках з імі ўжываюць беларускае мовы. Мы ж добра ведаем, што інспэктары школьныя—палякі, найбольш прыездныя з Галіцыі ці з конгрэсовай Польшчы і мовы нашае ня ведаюць. Якія ж з іх будуць наглядчыкі за б е л а р у с к а й школай? Калі гэта нагляд толькі з боку палітычнага, дык тады рэч зразумелая, але з педагогічна-навуковага, дык ня ім-жа гэта рабіць у беларускай школе.

Наагул кажучы, я не спадзяюся, каб па інструкцыі п. Гонсероўскага беларуская люднасьць здабыла для дзяцей сваіх беларускую школу нават прыватную.

Паслом Беларускага Соймавага Клюбу трэ' было-б шыбчэй зьвярнуць увагу на страшэнна ненармальны стан рэчаў у справе беларускага школьніцтва, калі яны ў гэтым хоць што небудзь могуць дапамагчы, бо далей гэтак як ёсьць цяпер быць не павінна.

Міхалкау Сымоњ.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Сьвядомасьць шырыцца.

(Вялейшчына)

Нацыянальная сьвядомасьць ахапіла Вялейскі павет. Да гэтага часу ён спаў, але цяпер прачнуўся і заварушыўся. Нацыянальны рух дайшоў ува ўсе, самыя глухія вёскі. Народ сьмела ўжо гаворыць хто ён і чаго хочыць. Пры рэгістрацыі салдат, калі рэгістратар пытае, якая матчына мова, хлопец сьмела і горда гаворыць беларуская! Гмінныя рады як Ільская і інш. вынясьлі пастановы, каб усе школы ў іх валасьцях былі беларускія. Самыя глухія і цёмныя вёскі, як прыкладам Рыбчына, Вязанскай вол. хочуць беларускіх школ. Да сваіх вучыцялёў, якія былі ў Кракаве на курсах і другі месяц сядзяць без занятку, прыходзяць сяляне і просяць адчыняць беларускія школы, хоць бы навет на кошт вёскі.

Пры выбарах у Сойм у нашым павеце сяляне галасавалі за два сьпіскі: за № 16 і за — 3. Цяпер тыя што галасавалі за Блёк тыкаюць пад нос газэту „Вызваленцам“, каб чыталі, хто ёсьць Хамінскі Ваявудзкі і інш. і сьмяюцца з іх. „Вызваленцы“ толькі патыліцу чэшуць і кажуць: „Ашуківалі нас многа разоў, але цяпер ужо ніхто не ашукае, старэеш і вучышся“.

У. Н.

Замучылі чалавека.

(Дзісьненшчына)

На каталіцкія запускі ў мяст. Галубічы прыехалі з Глыбокага тры конныя паліцыянты. Вечарам калі людзі ўжо сталі раз'ежджацца дамоў паліцыянты пераняўшы на дарозе грам. Гарасімёнка запатрабавалі пашпарта, а пасьля так зьбілі, што ў дарозе гр. Герасімёнак памёр. Пры гэтым катаваньні былі сьведкі, яго суседзі, якія і давязьлі цела Герасімёнка дамоў.

Нехта.

Школьная справа.

(Валожынскі пав.)

У вёсцы Гародзькі, Забрэскай гміны, адчынена польская школа, ў якую інспэктар назначыў 2-х вучыцеляк. Аднак жыхары Гародзькаў не паслалі сваіх дзяцей у школу бо дамагаліся беларускай школы. У школу хадзіла толькі 5 дзяцей.

Калядамі пасол Рак Міхайлоўскі быў у гэтай справе ў інспэктара, зазначаўшы яму ненармальнае становішча школы ў Гародзьках.

Пасьля гэтая справа паднята была ў школьнага куратара. Дазнаўшыся аб гэтым інспэктар нашоў за грошы вучыцеля Сіўца, які абняўшы пасаду вучыцеля беларускай мовы абецаўся да дня прыезда прадстаўніка ад куратара сабраць усіх дзяцей вёскі Горадзькі ў школу, каб гэтым апраўдаць інспэктара і скампрамітаваць пасло. Будучыня пакажа ці паздаровіцца гэтая подлая здрада Сіўцу.

П—Ч.

ХРОНІКА.

Вялікая беларуская газэта „Наша Будучына“ з № 5 закрыта праз месцовую ўладу да суда. Выпушчаны № 6 быў канфіскаваны.

„Беларускі Гоман“ аднаднёўка, вышаўшая ў Вільні 20 лютага была канфіскавана.

3 і 4 сакавіка (марца) адбудзецца надзвычайны сход сяброў Белар. Грамадзянскага Сабраньня. На парадку дня: 1 Прыняцьце кандыдатаў у лік сяброў. 2. Давыбары кандыдатаў у Раду Старшынь і рэвізыйную камісію і 3. Бягучыя справы. Сьпісак кандыдатаў вывешаны ў памешканьні Грам. Сабраньня. Сход назначаны на 7 гад. увечары.

Беларускае Таварыства Дапамогі Ахвярам Вайны просіць запісвацца ў сябры: гадавая складка 1000 мар. Таварыства мае пад сваей апекай два дзіцячых прытулкі; ў Вільні і ў Горадні па 100 дзяцей у кожным. Ня маючы пастаяных моцных грашовых крыніц і пры сучаснай ўсе узрастаючай дарагавізне К-ту вельмі трудна ўтрымліваць прытулкі і дзеля таго зьвяртаемся да грамадзянства з просьбай складаць ахвяры грашыма і натурай (збожа, бульба, палатно). Ахвяры прыймаюцца: Вільня, Віленская 12 кв. 6.

Вучыцель П. Транчэўскі за тое што меў беларускія газэты і правадзіў агітацыю ў час выбараў быў арыштаваны праз Дунілавіцкага Старасту і узята з яго падпіска аб нявыездзе з павету.

Гр. Транчэўскі меў школу ў вёсцы Порплішчэ Дунілавецкага павету, але за беларускую працу школьны інспэктар выкінуў яго са школы.

Районы начальнік ў мяст. Даўгінава (Вялейшчына) загадаў крамнікам пазьнімаць усе вывескі напісаныя пабеларуску (лацінікай).

З жыцьця беларусаў у Штаце Мічыган.

(Ад нашага ўласнага карэсп. з Амэрыкі).

У Штаце Мічыган беларусаў знаходзіцца паважны лік—прыблізна іх тут налічваецца да 20 тысяч. Жывуць яны галоўным чынам у м. Дэтройт і Гранд Рапідс — гэта самыя галоўныя цэнтры прамысловасьці Мічыгана.

Горад Дэтройт налічвае 993.678 жыхароў. Мае Унівэрсытэт і славіцца на ўсю Амэрыку сваімі Аўтамабільнымі хвабрыкамі. Тут знаходзяцца і галоўныя фабрыкі знамянітага Гэнрі Форда, сусьветнага аўтамабільнага караля, найбагачшага чэлавека ў сьвеці. Аўтамабільны завод Форда, як па сваём размеру, так і на тэмпу развіцьця займае сярод прамысловых прэдпрыемств першае месца ў Злучаных Штатах Амэрыкі. Да вайны фабрыка Форда выпускала больш, як 1.000 аўтамабіляў у дзень—цяпержа 4.000 г. з. каля 1.500.000 у год. Не так даўно лет 25 таму назад Форд быў бедным звычайным слесарам—а цяпер па багацьцю яму няма роўнага чалавека ў сьвеці.

У фабрыцы Форда працуе многа нашых беларусаў. Зарабляюць яны тут надта добра найменшая плата 5 даляраў у дзень для непрафэсыянальнага работніка, а найбольшая 10—15 за 8-м гадзінную дзённую працу.

Трэба адзначыць, што Форд за ўсіх фабрыкантаў славіцца тым, што найбольш плаціць работнікам. Трэба толькі Форду аб'явіць у газэтах, што яму патрэбны рабочыя сілы-як з усіх Злучаных Штатаў пасьпяшаць ня толькі тысячамі. але і дзяткамі тысяч рабочыя, каб толькі ў яго атрымаць „джаб“—работу—а гэта роўназначна, што найсьці залаты скарб.

Але ня толькі ў Форда працуюць беларускія эмігранты, многія маюць добрую работу і ў іншых фабрыках як напрыклад, „Бады Фініш Компані“—дзе таксама маюць добры заработак.

Другія зноў, каля вырубкі вядомых Мічыганскіх лясоў—тут маюць 100 доляроў у месяць і жыцьцё. Трэцяя катэгорыя зноў аселілася на фармах (калёніях), яны працуюць толькі вясною, летам і восеньню—а на зіму кожны сьпяшаецца зноў да фабрыкі.

Што тычыцца Гранд Рапідс, дык ён славіцца сваімі сталярскімі фабрыкамі, якіх тут налічваецца 250. Ен па характару і па лагоднасьці клімату займае адно з найлепшых мейсц. Тут няма тае удушлівай атмасфэры Чыкага і Нью-Іорка.

Заробкі тут таксама добрыя. Сталяр атрымвае ад 35 да 45 дал. у тыдзень за 9 гадзінную работу. Такую больш менш суму мае кожны прафэсыянальны рабочы спэцыаліст. А работнік, які ня знае сталярскай працы мае, не жанаты 20—21 дол., жанаты дастае 21.50—25 дал. у тыдзень, выплата заўсягды бывае толькі тыднёвая.

Некаторыя працуюць на жалезнай дарозе і у жалезнадарожных майстэрнях тут плата рожніцца найменшая 30—32, найбольшая 40 долл.

Шмат беларусаў занялося і гандлям, маюць рэстараны, калоніяльныя таргоўлі, мясныя. Гэта кляса, беларускіх біжэсістаў (гандляроў), самая заможная. Майнасьць кожнага амаль ацэніваецца ад 12 тысяч да 30 тысяч доляроў.

Беларус, які аставіў сваю Бацькаўшчыну і жывучы там у страшнай соцыяльным занепадзе, калі ў хаце сваей ня меў часамі ані „солі, ані круп“—тут сапраўды для яго рай... Дзякуючы сваей скупасьці прыроднай, ашчаднасьці і надзвычайнай працавітасьці ён у Амэрыцы прыйшоў у сілу гэтых прычын да дабрабыту. З усіх тут нашых эмігрантаў 90% маюць свае дамы—ў срэднем маемасьць кожнага ацэніваецца ад 4 тысяч да 6 тысяч даляроў пры чым яшчэ маюць гатоўкі у банках.

Так выглядае беларус па свайму соцыяльнаму становішчу ў Штаце Мічыган—мне ўдалося устанавіць, што беларусы тут з матэр'яльнага боку занімаюць першае мейсца сярод нашых эмігрантаў у Злучаных Штатах. Асабліва эўрапэйская вайна прычынілася да паляпшэньня быту эміграната, бо ў гэты час заробкі былі дубэльтовыя.

У грамадзкай справе беларус ачнуўшоў на апошняе месьсца. Такому з'явішчу нельга дзівіцца.

Большая палавіна нашае эміграцыі ў Амэрыцы складалася з людзей, якія на Бацькаўшчыне ня атрымалі нават і пачатковай асьветы, а прытым з роднага краю выежджалі з забітым духоўным і нацыянальным пачуцьцём праз расейскую царскую ўладу, праваслаўную царкву і каталіцкі касьцел. Аднак любоў да ўсяго роднага пылае ў грудзях беларусаў-эмігрантаў. У восені калі цяпер у Штаце Мічыган началася праца культурная і палітычная—наш эмігрант таксама прыняўся і да грамадзкай справы. Сталі ужо закладывацца гурткі і Таварыства. Паявіліся беларускія газэты і літэратура і беларускі адраджэнскі, незалежніцкі рух ўсе больш і больш умацоўваецца.

Л. Ч.

Беларусы у Латвіі.

КРАСЛАУКА. 4 лютага, Крэслаўскім Аддзелам Беларускага Таварыства „Бацькаўшчына“ ладжана была ужо трэцьцяя вечарына ў гэтай зіме. Стаўлялі „Міхалу“ Далецкіх і „Збянтэжаны Саўка“ Л. Родзевіча. Удалую гульню артыстаў горача вітала публіка, якая запоўніла ўсю залю.

КРАСЛАУКА. 27 студня. У памешканьні Беларускай школы вядомая дзеячка П. Мядзёлка-Грыб прачытала лекцыю на тэму: Роль нацыянальнасьці ў стварэньні агульна-людзкой культуры. Лекцыя вельмі зацікавіла сабраўшыхся крэслаўцаў, якія атрымалі яркае асьвятленьне пытаньняў, закранутых у лекцыі.

Лекцыю ладзіў Крэслаўскі Аддзел Белар. Т-ва „Бацькаўшчына“.

Тутэйшы.

Курс на грошы.

(Віленская біржа.)

За 22 лютага.

Долары	50.500
10 залатых рублёў . , . . .	296.000

Рэдактар-Выдавец Францішак Аляхновіч.

Друкарня С. Бэккэра, Субач, 2.